***Г.І. Крэбс***
*БДЭУ (Мінск)*
*Навуковы кіраўнік — кандыдат эканамічных навук В.Б. Гурко*

# РАЗВІЦЦЁ КІРАЎНІЦКАГА ЎЛІКУ Ў ГАНДЛЁВЫХ АРГАНІЗАЦЫЯХ ВА ЎМОВАХ ІНФЛЯЦЫІ

Кіраўніцтва прадпрыемства штодня прымае рашэнні — як па бягучых пытаннях вытворчасці, закупак, рэалізацыі, так і стратэгічнага характару, у галіне крэдытнай палітыкі, інвестыцый, кірункаў развіцця. Для гэтага неабходна аператыўная і дакладная інфармацыя аб фінансава-гаспадарчай дзейнасці прадпрыемства. Забеспячэнне кіраўнічага персаналу такой інфармацыяй з'яўляецца задачай кіраўніцкага ўліку [1, с. 15].

Трэба адзначыць, што пры ўкараненні ў арганізацыі кіраўніцкага ўліку амаль заўсёды ўзнікаюць сур'ёзныя цяжкасці, выкліканыя самымі разнастайнымі прычынамі. У якасці асноўных можна вылучыць наступныя:

- нежаданне кіраўнікоў цэнтраў адказнасці своечасова прадастаўляць поўную інфармацыю аб дзейнасці сваіх падраздзяленняў;
- адсутнасць лакальнай камп'ютарнай сеткі, адзінай сістэмы дакументазвароту, дакладнай арганізацыйна-функцыянальнай структуры;
- нежаданне асобных супрацоўнікаў перабудоўваць сваю дзейнасць, запаўняць розныя кіраўніцкія справаздачы з-за неразумення ролі кіраўніцкага ўліку;
- дэфіцыт кваліфікаваных спецыялістаў, якія валодаюць ведамі як у кіраўніцкім, так і ў бухгалтарскім і падатковым уліку;
- супрацьдзеянне работнікаў фінансавай бухгалтэрыі, якім спецыялісты па кіраўніцкім уліку часта прадстаўляюцца прафесійнымі канкурэнтамі [2, с. 84].

Аднак менавіта кіраўнік павінен бачыць неабходнасць пастаноўкі кіраўніцкага ўліку. Мэтазгодна казаць аб стварэнні спецыяльнага падраздзялення ў арганізацыі для мэт кіраўніцкага ўліку.

У Беларусі можна назіраць нестабільную эканамічную сітуацыю. Арганізацыям гандлю неабходна пастаянна карэктаваць свае выдаткі ў суадносінах да інфляцыі. Менавіта кіраўніцкі ўлік прапануе нам шматлікія метады рэгулявання сваіх выдаткаў з мэтай эфектыўнага кіравання арганізацыяй.

*Метады кіраўніцкага ўліку ў галіне кантролю выдаткаў*

АВС-аналіз — аналіз таварных запасаў шляхам падзелу на тры катэгорыі: А — найбольш каштоўныя, 20 % — асартыменту; 80 % — продажаў; В — прамежкавыя, 30 % — асартыменту; 15 % — продажаў; С — найменш каштоўныя, 50 % — асартыменту; 5 % — продажаў.

Прымяненне элементаў метаду АВС-аналізу ў арганізацыях гандлю дасць магчымасць якасна кіраваць таварнымі патокамі.

Маржынальны аналіз — аналіз суадносін аб'ёму продажаў (выпуску прадукцыі), сабекошту і прыбытку на аснове прагназавання ўзроўню гэтых велічынь пры зададзеных абмежаваннях. Чым больш маржынальны даход, тым хутчэй будуць перакрытыя пастаянныя выдаткі і тым хутчэй арганізацыя (прадпрыемства) пачне атрымліваць прыбытак.

Бюджэтаванне ўяўляе сабой працэс пабудовы і выканання бюджэту — узгодненага і збалансаванага фінансавага плана дзейнасці і развіцця арганізацыі (або яе асобных падраздзяленняў). Выкарыстанне сістэмы бюджэтавання стварае для арганізацыі шэраг пераваг.

Многія гандлёвыя арганізацыі для таго, каб прыцягваць усё больш пакупнікоў, ужываюць дысконтныя карты, сертыфікаты, інтэрнэт-гандаль і іншыя метады. У асноўным гандлёвыя прадпрыемствы выкарыстоўваюць для мэт кіраўніцкага ўліку замежную валюту (бо яна з'яўляецца пастаяннай велічынёй) — долар, еўра, некаторыя прадпрыемствы пры пастаноўцы стратэгічнага ўліку могуць нават выкарыстоўваць прыдуманую грашовую адзінку.

У мэтах практычнага даследвання было праведзена апытанне сярод кіраўнікоў гандлёвых арганізацый. Рэзультаты апытання паказалі, што ўлік актываў для мэт кіраўніцкага ўліку пераважна вядзецца ў доларах. 70 % апытаных кіраўнікоў кажуць, што кіраўніцкі ўлік не вядзецца ў іх арганізацыях, аднак 100 % кажуць аб неабходнасці пастаноўкі кіраўніцкага ўліку.

Кіраўніцкі ўлік неабходны арганізацыям гандлю для таго, каб эфектыўна развівацца ў сучасных умовах не толькі ў Беларусі, але і ў краінах замежжа. У цяперашні час кіраванне гандлёвай кампаніяй немагчыма без выкарыстання сістэмы кіраўніцкага ўліку. Добра арганізаваны кіраўніцкі ўлік не толькі забяспечвае кантроль за бягучай дзейнасцю кампаніі, але і стварае перадумовы для яе паспяховай працы ў будучыні.

### Літаратура

1. *Казакова, Н. А.* Кіроўчы аналіз і аўдыт прадпрыемства ва ўмовах крызісу : падруч. / Н. А. Казакова. — М. : Справа і Сэрвіс, 2010. — 256 с.

2. *Гурко, В. Б.* Бухгалтарскі кіраўніцкі ўлік у гандлі : вуч.-метад. дапаможнік / В. Б. Гурко. — Мінск : БДЭУ, 2012. — 183 с.

***О.А. Люцко***
*БГЭУ (Минск)*
*Научный руководитель — кандидат экономических наук Е.Н. Шибеко*

## ПЕРЕОЦЕНКА ОСНОВНЫХ СРЕДСТВ И ЕЕ ВЛИЯНИЕ НА ДЕКАПИТАЛИЗАЦИЮ ИХ СТОИМОСТИ

Для более точного и объективного отражения текущего состояния основных средств организации могут использовать учет активов по переоцененной стоимости. Переоценка основных средств способствует



БДЭУ. Беларускі дзяржаўны эканамічны універсітэт. Бібліятэка.
БГЭУ. Белорусский государственный экономический университет. Библиотека.°.
BSEU. Belarus State Economic University. Library.
http://www.bseu.by elib@bseu.by